***Носік А.А.***

# ВЫХАВАЎЧЫ КАМПАНЕНТ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЧАСТКА АГУЛЬНАЙ СІСТЭМЫ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ Ў МЕДЫЦЫНСКАЙ ВНУ

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле закранаецца пытанне арганізацыі выхаваўчага працэсу пры вывучэнні беларускай мовы ў медыцынскім універсітэце. Абгрунтавана думка наконт важнасці асабістага ўкладу выкладчыка ў сістэму адукацыі і выхавання ў вышэйшай школе.

*Ключавыя словы: выхаванне, адукацыя, медыцына, беларуская мова.*

*Nosik A.A.*

# EDUCATIONAL COMPONENT IN THE PROCESS OF STUDYING THE BELARUSIAN LANGUAGE AS A PART OF THE GENERAL SYSTEM OF EDUCATIONAL WORK IN MEDICAL UNIVERSITIES

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract.** The article deals with the organization of the educational process for the study of the Belarusian language in the medical university. The article touches upon the issue of the importance of the teacher's personal contribution to the system of education and upbringing in higher education.

*Keywords: upbringing, education, medicine, the Belarusian language.*

На сучасным этапе развіцця адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь кожная ВНУ, нават тэхнічнага профілю, мае цыкл гуманітарных дысцыплін. Галоўная задача вышэйшай адукацыі зводзіцца да гарманізацыі гуманістычнага прафесійнага складніка самасвядомасці і тэхналагічнага авалодання асновамі практычнай дзейнасці.

Сістэма прафесійнага выхавання асобы будучага медыцынскага работніка ўяўляе сабой складаны комплекс узаемазвязаных кампанентаў (кагнітыўнага, эмацыянальна-валявога, дзейсна-паводзіннага) і накіравана на фарміраванне ўсвядомленага стаўлення да выканання сваіх прафесійных абавязкаў.

Несумненна, у наш час медыцынская адукацыя з’яўляецца адным з самых прагрэсіўных накірункаў, якi ўяўляе сабой план падрыхтоўкі кампетэнтнага спецыяліста праз засваенне прафесійных ведаў і фарміраванне ўменняў і навыкаў аказання практычнай дапамогі.

Засваенне беларускай мовы ў прафесійным аспекце накіравана на ажыццяўленне вербальных зносін у афіцыйнай сферы, якое прадугледжвае веданне як агульнаўжывальнай, так і вузкаспецыяльнай тэрміналагічнай лексікі праз выкарыстанне розных відаў творчых прац па развіцці маўлення: пераказу, перакладу, сачынення [2].



Рэпазіторый БДМУ

Беларуская мова для студэнтаў-медыкаў выкладаецца ў строгай адпаведнасці з Праграмай, якая прадугледжвае засваенне і прафесійнае выкарыстанне беларускай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць розную інфармацыю на беларускай мове, а таксама дакладна і асэнсавана выказваць любую думку, спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Мэтай курса з'яўляецца выпрацоўка і замацаванне практычных уменняў і навыкаў дасканалага карыстання вуснай і пісьмовай мовай; развіццё моўна-эстэтычнага густу студэнтаў, звязанага з чысцінёй і правільнасцю мовы; пашырэнне і ўзбагачэнне прафесійнага лексічнага запасу будучых спецыялістаў, выпрацоўка ўменняў практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці; фарміраванне ўстаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці; выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуцця нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі, імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы. Зыходзячы з названых акалічнасцей, праца накіравана на ажыццяўленне *грамадска-патрыятычнага, духоўна-маральнага* і *эстэтычнага* накірункаў выхаваўчага працэсу і засваенне найважнейшых жыццёвых каштоўнасцей, такіх як сям'я, праца, талерантнасць, правы чалавека, патрыятызм, служэнне Айчыне, грамадзянскі абавязак, узаемападтрымка, павага да гісторыка-культурнай спадчыны і законаў сваёй краіны. Выхаваўчыя мэты, такім чынам, сыходзяцца на фарміраванні гарманічна развітай асобы і арыентаваны на паспяховае ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці ва ўмовах білінгвізму.

У працэсе вывучэння беларускай мовы найбольшая ўвага акцэнтуецца на выхаванні культуры паводзін, справядлівасці, здольнасці да суперажывання. Гэта дасягаецца за кошт увядзення ў навучальны працэс твораў беларускіх аўтараў, дзе закранаюцца вельмі важныя пытанні медыцынскай і агульначалавечай маралі (М. Герчык "Здабыццё надзеі", А. Дзялендзік "Выклік багам", А.Федарэнка "Ланцуг" і інш.).

Эстэтычнае выхаванне накіравана на развіццё эстэтычнага густу і раскрыццё творчых здольнасцей праз арганізацыю і ўдзел кафедральных і агульнаўніверсітэцкіх мерапрыемстваў, удзеле ў фестывалях і конкурсах міжвузаўскага, гарадскога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў.

Арганізацыя студэнцкай навуковай дзейнасці – вельмі неабходны элемент навучання, паколькі гэта спрыяе фарміраванню глыбокіх featureнабаковых ведаў, уменню карыстацца навуковай літаратурай, адбіраць неабходны матэрыял, выпрацоўваць навыкі валодання навуковай беларускай мовай і тым самым усведамляць яе шырокія камунікатыўныя магчымасці. Эфектыўнае спалучэнне навукова-даследчай і творчай дзейнасці спрыяе развіццю здольнасцей студэнтаў да напісання навуковых прац, павышэнню аўтарытэту і значнасці студэнцкай навукі наогул.

Маўленне ўрача – гэта складаны акт, які павінен ажыццяўляцца з улікам правіл маўленчых паводзін, прынятых у грамадстве, а таксама з падтрыманнем грамадскіх функцый беларускай мовы, прадугледжаных заканадаўствам.

Маўленчая сітуацыя ў прафесійным асяроддзі ўрача вымагае ад яго ўлічваць ілакутыўныя мэты, псіхалагічны стан адрасата, інтарэсы камунікантаў (свае і субяседніка) і многія іншыя аспекты, прадыктаваныя канкрэтнымі абставінамі. Формы арганізацыі выхаваўчай работы адпавядаюць плану выхаваўчай работы кафедры, факультэта, універсітэта. Уся сістэма накіравана на фарміраванне кампетэнцый будучага спецыяліста і яго маральных якасцей.

На сённяшні дзень для будучага ўрача Рэспублікі Беларусь надзвычай важна правільна зразумець сутнасць дзяржаўнага двухмоўя і выпрацаваць уменне жыць і працаваць у прававым полі, адным з важных аспектаў якога з'яўляецца прытрымліванне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 187-З ад 13 ліпеня 1998 г.). Праз свае ўстановы дзяржава павінна забяспечыць кожнаму грамадзяніну права карыстацца той ці іншай мовай. Адсюль кожны супрацоўнік дзяржаўнай установы, з'яўляючыся прадстаўніком дзяржавы, павінен абавязкова валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі [1]. Усвядоміць вышэйсказанае дапаможа вялікая і правільна арганізаваная работа, якая павінна гарманічна спалучыць навучальны і выхаваўчы аспекты

Такім чынам, урач, з'яўляючыся прыкладам гуманізму, інтэлігентнасці, сумленнасці, прынцыповасці, бескарыслівасці, ветлівасці, павагі да навакольных самастойнасці, мэтанакіраванасці і многіх іншых станоўчых якасцей чалавека, адным з прыярытэтаў сваёй дзейнасці павінен таксама мець паважлівае і адказнае стаўленне да беларускай мовы [3]. Дасягненне высокага ўзроўню адукаванасці немагчыма без удасканалення інтэлектуальнай культуры і пераадолення пэўных стэрэатыпаў у поглядах на ролю беларускай мовы і шматгадовага вопыту папярэдніх пакаленняў у выхаванні патрыятызму, любові і павагі да роднай зямлі, нацыянальнай культуры, навукі і будучай прафесіі.

**Літаратура**

1. Лукашанец, А.А. Беларуская мова ў XXI стагоддзі : развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання / А.А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 396 с.

2. Носік, А.А. Пераклад тэкстаў медыцынскай тэматыкі як сродак выхавання і навучання прафесійнай лексіцы / А.А. Носік, Н.В. Ратынская. – XX Міжнародная навуковапрактычная канферэнцыя "Тэхналогіі навучання рускай мове як замежнай і дыягностыка моўнага развіцця" (эл. зборнік). – Мінск: БДМУ, 2019. – С. 301 – 306.

3. Носік, А.А. Арганізацыя выхаваўчай работы са студэнтамімедыкамі ў працэсе вывучэння беларускай мовы / А.А. Носік. – Материалы III международной научно-методической конференции. Под редакцией А.Р.Аветисова. 2019. – С. 204 – 206.

Репозиторий БГМУ